

# КРЫНІЧКА


**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынская базавая школа”**

Выпуск №7 (32)
Сакавік 2023


## У нумары:


| | |
|---|---|
| **Скажы “НЕ” наркотыкам!** | **Стар. 1** |
| **Раённы бацькоўскі сход** | **Стар. 2** |
| **Адзіная інфармацыйная гадзіна** | **Стар. 2** |
| **Святочны канцэрт “Вясновы настрой”** | **Стар. 3** |
| **15 сакавіка – Дзень Кастытуцыі Рэспублікі Беларусь** | **Стар. 4** |
| **Адзіны ўрок памяці, прысвечаны трагедыі Хатыні** | **Стар. 5** |
| **ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна** | **Стар. 6** |


# Скажы “НЕ” наркотыкам!

**“Скажы “НЕ” наркотыкам!”** пад такім дэвізам 1 сакавіка адбыўся **круглы стол** для вучняў 5-9 класы. Падчас мерапрыемства рабяты пагаварылі аб шкодзе ўжывання наркатычных сродкаў і аб наступствах іх ужывання. Таксама спыніліся на адказнасці за ўчыненыя злачынствы, звязаныя з ужываннем, захоўваннем і распаўсюджваннем наркатычных рэчываў.








# Раённы бацькоўскі сход

3 сакавіка законныя прадстаўнікі вучняў 1-9 класаў прынялі ўдзел у раённым бацькоўскім сходзе **"Як забяспечыць інфармацыйную бяспеку дзяцей у сетцы Інтэрнэт"**.

У рамках бацькоўскага сходу былі разгледжаны пытанні бяспекі непаўналетніх у сетцы Інтэрнэт. Таксама разгледжана пытанне аб тым, як не патрапіць на вуду махляроў. Асаблівая ўвага ў ходзе бацькоўскага сходу была нададзена маладзёжнаму фарміраванню "Редан".




# Адзіная інфармацыйная гадзіна

10 сакавіка ва ўстанове адукацыі адбылася **адзіная інфармацыйная гадзіна** для вучняў старэйшых класаў па тэме **"Мы ў інтэрнэт-прасторы: як абараніцца ад маніпуляцый"**.

У рамках інфармацыйнай гадзіны дзецям яшчэ раз нагадалі пра небяспекі, якія падсцерагаюць іх у Інтэрнэце, а таксама расказалі пра магчымыя спосабы маніпуліраванне ў Інтэрнэце і пра метады абароны ад маніпуліравання.




# Святочны канцэрт "Вясновы настрой"




Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня 8 Сакавіка ў школе адбыўся вялікі **святочны канцэрт "Вясновы настрой"**.

Юныя артысты школы падарылі прысутным у зале жанчынам усмешкі, радасць і добры настрой. У адрас усіх жанчын прагучалі шчырыя словы з пажаданнямі здароўя, удачы і міру! Музычныя нумары, тэатральныя пастаноўкі, душэўныя вершы - усё гэта чакала гледачоў святочнай канцэртнай праграмы.

Канцэрт па-сапраўднаму атрымаўся вельмі цёплым і душэўным!














# 15 сакавіка – Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь




Напярэдадні дзяржаўнага свята, прысвечанага Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у 4-6 класах прайшла інфармацыйная гадзіна. Вучні даведаліся пра ключавыя каштоўнасці, якімі павінны кіравацца жыхары краіны і яе кіраўніцтва. Даведаліся, пра што напісана ў Канстытуцыі, якія змяненні адбываліся з асноўным законам на працягу 29 гадоў. Размаўлялі пра правы і абавязкі. Асноўны абавязак грамадзяніна - паважаць Канстытуцыю.





15 сакавіка ў школе прайшла **ўрачыстая лінейка, прысвечаная Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.**

З прывітальнымі словамі да прысутных звярнуўся дырэктар школы Крываротa Аляксандр Сяргеевіч. У святочнай атмасферы вучням школы, якім споўнілася 14 гадоў, уручылі кнігі "Я - грамадзянін Рэспублікі Беларусь". Гэта выдатна аформлены альбом пра нашу Радзіму, яе гісторыю, дзяржаўны лад, непаўторную прыроду, нацыянальныя традыцыі і перспектывы развіцця. На мерапрыемстве юных грамадзян павіншавалі з такой значнай падзеяй у іх жыцці і пажадалі быць дастойнымі гэтага высокага звання.



# Адзіны ўрок памяці, прысвечаны трагедыі Хатыні




22 сакавіка быў праведзены **адзіны ўрок памяці, прысвечаны трагедыі Хатыні.** Назву невялікай беларускай вёскі Хатынь ведаюць ва ўсім свеце. 22 сакавіка 1943 года яе спалілі разам з жыхарамі. І сёння мемарыяльны комплекс, усталяваны на месцы спаленай вёскі, – сімвал трагедыі беларускага народа і помнік усім спаленым вёскам.

Трагедыя ў Хатыні - гэта ўрок для ўсёй мірнай супольнасці і напамін пра недапушчэнне гераізацыі нацысцкіх злачынцаў і іх ідэй.

Вучні і педагогі ўстановы адукацыі ўшанавалі памяць ахвяр трагедыі ў Хатыні і ахвяр генацыду беларускага народа.









# ШАГ: Школа Актыўнага Грамадзяніна

23 сакавіка ва ўстанове адукацыі адбыўся круглы стол у рамках інфармацыйна-адукацыйнага праекта **ШАГ: "Гонар за Беларусь. Камфорт і ўтульнасць для кожнага"**.

Вучні прынялі актыўны ўдзел у абмеркаванні пытанняў, якія датычацца развіцця і ўдасканалення будаўніча-прамысловага комплексу, жыллёвага будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. У якасці інфармацыйнай асновы былі выкарыстаны відэаролікі і відэасюжэты, падрыхтаваныя Нацыянальным інстытутам адукацыі.

Ініцыятыўнай групай навучэнцаў падрыхтавана прэзентацыя "Так жывуць у нашым аграгарадку".

У абмеркаванні пытанняў прыняў удзел Посах Яўген Андрэевіч, прараб філіяла "Фалька-Агра" ААТ "Агракамбінат Дзяржынскі". Яўген Андрэевіч акцэнтаваў увагу на пытаннях будаўніцтва жылля ў гаспадарцы.




Галоўны рэдактар – Ярашэвіч Мар’яна, вучаніца 8 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 29 красавіка.
Тыраж – 15 нумароў. Кошт – 1 руб.